(ознакомительный фрагмент)

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УДК 327(476; 474.5)(043)

**БАГАЛЕЙША СВЯТЛАНА ВІКТАРАЎНА**

# БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІЯ ЎЗАЕМААДНОСІНЫ Ў 1915-1924 гг.

Спецыяльнасць 07.00.02 – айчынная гісторыя

Аўтарэферат дысертацыі
на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук

Мінск – 2006

Работа выканана ў
Беларускім дзяржаўным універсітэце

Навуковы кіраўнік - доктар гістарычных навук, прафесар
**Ладысеў Уладзімір Фёдаравіч,**
(Беларускі дзяржаўны універсітэт,
кафедра гісторыі Беларусі
новага і навейшага часу)

Афіцыйныя апаненты: доктар гістарычных навук, прафесар,
**Тугай Уладзімір Васільевіч,**
(УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны
універсітэт імя Максіма Танка",
кафедра гісторыі старажытных
цывілізацый і сярэднявякоўя)

кандыдат гістарычных навук, дацэнт
**Багдановіч Алена Генадзеўна,**
(УА "Беларускі нацыянальны тэхнічны
універсітэт," кафедра гісторыі, сусветнай і
мастацкай культуры)

Апаніруючая арганізацыя - УА "Беларускі дзяржаўны
тэхналагічны універсітэт"

Абарона адбудзецца **"23" сакавіка 2006г.** у **14.00** гадзін на пасяджэнні Савета па абароне дысертацый Д 02. 01. 05. на атрыманне вучонай ступені доктара гістарычных навук пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасу: г. Мінск, вул Ленінградская 8, ауд. 407. Тэлефон вучонага сакратара: 227-45-11.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Аўтарэферат разасланы "21" лютага 2006г.

Вучоны сакратар
Савета па абароне дысертацый Д.02.01.05
доктар гістарычных навук, дацэнт В.І. Менькоўскі

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.**

Гісторыя Беларусі навейшага часу фарміравалася не толькі пад уплывам унутраных працэсаў і фактараў. Важную ролю ў фарміраванні нацыянальнай дзяржаўнасці адыгралі знешнепалітычныя сілы суседніх дзяржаў – Расіі, Літвы, Польшчы, Украіны. У пераломныя моманты айчыннай гісторыі ўплыў гэтых дзяржаў на лёс Беларусі быў значны, а ў шэрагу момантаў і вызначальны. Таму ўсебаковы разгляд розных напрамкаў беларуска-літоўскіх узаемаадносін ў 1915-1924 гг., паказ гісторыі Беларусі ў геапалітычным кантэксце з'яўляецца не толькі актуальным, але і практычна значным для сучаснай дзяржаўнай палітыкі.

Распрацоўка вызначанай тэмы набывае асаблівую актуальнасць на этапе суверэннага развіцця беларускай дзяржаўнасці для асэнсавання вопыту ўзаемаадносін у мінулым дзеля аптымізацыі знешнепалітычнага курсу Рэспублікі Беларусь, для планавання і аналізу сучасных беларуска-літоўскіх узаемадачыненняў. Зараз Літва з'яўляецца адным з вядучых партнераў Беларусі. Адносіны, якія склаліся паміж дзяржавамі, не абмяжоўваюцца толькі палітычнымі і эканамічнымі кантактамі. Яны закранаюць усе бакі міждзяржаўных, сацыякультурных сувязей. І таму зразумела, што паспяховае развіццё гэтых працэсаў немагчыма без уліку рэалій гістарычнага мінулага, у тым ліку ў галіне палітычных, культурных і ваенных узаемаадносін у 1915-1924 гг.

На жаль, нягледзячы на навуковую і грамадска-палітычную актуальнасць тэмы, грунтоўнага яе даследавання не праводзілася ні навукоўцамі нашай рэспублікі, ні замежнымі даследчыкамі. Сказанае пацвярджае неабходнасць глыбокага і дэталёвага даследавання беларуска - літоўскіх узаемаадносін у 1915-1924 гг., - перыяд станаўлення нацыянальнай дзяржаўнасці беларускага і літоўскага народаў.

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі, тэмамі.** Тэма кандыдацкай дысертацыі адпавядае навуковай праблематыцы кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу, на якой суіскальніца вучонай ступені праходзіла аспіранцкую падрыхтоўку.

**Мэты і задачы даследавання.** Мэта кандыдацкай дысертацыі – правядзенне на падставе апублікаваных і архіўных крыніц усебаковага і грунтоўнага аналізу асноўных напрамкаў беларуска-літоўскіх ўзаемаадносін ў 1915-1924 гг. Для дасягнення пастаўленай мэты аўтар імкнулася рэалізаваць наступныя даследчыя задачы:

1) Разгледзець першыя праекты стварэння беларуска-літоўскай дзяржавы ў форме "Канфедэрацыі Вялікага княства Літоўскага" і "Злучаных Штатаў ад Балтыйскага да Чорнага мораў"; 2) прасачыць эвалюцыю палітычных ўзаемаадносін паміж Радай БНР і літоўскай Тарыбай ў 1918-1924 гг.; 3) раскрыць характар дзейнасці і структуру Міністэрства беларускіх спраў пры літоўскім урадзе; асаблівасці беларуска-літоўскага вайсковага супрацоўніцтва; 4) выявіць аб'ектыўныя і суб'ектыўныя фактары, якія паўплывалі на развіцце беларуска-літоўскіх узаемаадносін, вызначыць прычыны іх згортвання; 5) прааналізаваць пазіцыю Рады БНР і беларускіх палітычных арганізацый ў польска-літоўскім канфлікце 1920-1922 гг; 6) паказаць ступень ўплыву польска-літоўскага канфлікта на характар беларуска-літоўскіх узаемаадносін.

**Аб'ект і прадмет даследавання.** Аб'ектам даследавання з'яўляецца гісторыя Беларусі І-й чвэрці ХХ стагоддзя ў кантэксце міжнародных стасункаў ва Усходняй Еўропе. Прадмет даследавання - беларуска-літоўскія ўзаемаадносіны ў 1915-1924 гг., ўплыў на іх унутрыпалітычных і знешнепалітычных фактараў.

**Храналагічныя рамкі даследавання** абмежаваны 1915-1924 гадамі. Пачатак даследавання абумоўлены тым, што ўвосень 1915 г. значная частка заходняй Беларусі, на якой засталася частка дзеячаў беларускага нацыянальнага руху, была акупіравана германскімі войскамі і менавіта там з найбольшай сілай паўстала пытанне аб беларускай дзяржаўнасці, былі прыняты першыя крокі ў яго рэалізацыі, выпрацаваны першыя праекты ўтварэння беларуска-літоўскай дзяржавы. Даследаванне завяршаецца 1924 годам. Гэта абумоўлена тым, што пасля вырашэння на карысць Польшчы так званага "Віленскага пытання" беларуска-літоўскія ўзаемаадносіны на працягу 1923-1924 гг. пачалі пагаршацца і фактычна спыніліся; 20 студзеня 1924 г. спыніла сваю дзейнасць Міністэрства беларускіх спраў пры літоўскім урадзе, дзеячы беларускага нацыянальнага руху пакінулі Вільню і пераехалі ў Прагу.

**Метадалогія і метады даследавання.** Метадалагічнай і тэарэтычнай асновай даследавання з'явіліся прынцыпы гістарызму (разгляд асобных тэндэнцый у канкрэтна-гістарычнай абстаноўцы), аб'ектыўнасці (разгляд кожнай з'явы ў яе супрацьлегласці і мнагагgranнасці) і сістэмнасці (даследаванне аб'ектаў як цэласных сістэм, выяўленне іх унутраных і знешніх сувязей). У працэсе даследавання аўтар выкарыстоўвала як агульнанавуковыя (лагічны, індукцыі, дэдукцыі, аналізу і сінтэзу), так і спецыяльна-гістарычныя метады (гісторыка-генетычны, параўнальна-гістарычны і гісторыка-сістэмны ), на аснове якіх ажыццяўляла аналіз праблемы.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.**

Дысертацыя прадстаўляе сабой першае глыбокае даследаванне праблемы беларуска-літоўскіх узаемаадносін у 1915-1924 гг. Аўтарам прааналізаваны ўсе важнейшыя аспекты і напрамкі беларуска-літоўскіх узаемаадносін у 1915-1924 гг. (палітычны, культурны, ваенны ), вызначаны асноўныя прычыны (унутраныя і знешнія), формы і шляхі беларуска-літоўскага супрацоўніцтва ў акрэслены перыяд (стварэнне народных камітэтаў, сумесных арганізацый, беларускіх палітычных прадстаўніцтваў у Літве). Па-новаму разгледжаны спробы ажыццяўлення і прычыны заняпаду першых праектаў стварэння беларуска-літоўскай дзяржавы ў форме Канфедэрацыі ВКЛ і Злучаных штатаў ад Балтыйскага да Чорнага мораў ( прэтэнзіі літоўскіх лідэраў адыгрываць кіруючую ролю ў Канфедэрацыі, незацікаўленасць кіраўніцтва кайзераўскай Германіі ў адраджэнні гістарычнай Літвы).

У дысертацыйнай рабоце аўтарам упершыню ў беларускай гістарыяграфіі ўсебакова асветлены шляхі палітычнага супрацоўніцтва ўрада БНР з літоўскай Тарыбай у 1918 – 1924 гг., паказаны дваякі характар беларуска-літоўскіх узаемаадносін (адсутнасць адзінай знешнепалітычнай лініі, цяжкасці фінансавага забеспячэння Міністэрства беларускіх спраў і беларускіх ваенных адзінак у Літве). Раскрыты прычыны заключэння і змест асноўных ўмоў дагавора аб палітычным супрацоўніцтве паміж урадамі БНР і Літвы ад 27 лістапада 1918 г. і 11 лістапада 1920 г., іх уплыў на станаўленне і развіцце беларуска-літоўскіх узаемаадносін. Упершыню ўсебакова прааналізавана пазіцыя ўрада БНР, беларускіх палітычных

партый і арганізацый у польска-літоўскім канфлікце 1920 г., адносіны беларускіх нацыянальных дзеячаў да расійска-літоўскага мірнага дагавора 12 ліпеня 1920 года, перыядызацыя дзейнасці Міністэрства беларускіх спраў пры літоўскім урадзе, фарміраванне і існаванне беларускіх ваенных адзінак у Літве. Вызначаны ўнутраныя і знешнія прычыны, якія паўплывалі на згортванне беларуска-літоўскага супрацоўніцтва ў 1923-24 гг.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Вывады і асноўныя палажэнні дысертацыйнай работы могуць быць выкарыстаны пры напісанні абагульняючых прац і падручнікаў па айчыннай гісторыі, пры распрацоўцы агульных і спецыяльных курсаў па гісторыі Беларусі. Атрыманыя вынікі могуць стаць састаўной часткай базы для далейшага даследавання праблем знешняй палітыкі гісторыі Беларусі, могуць выкарыстоўвацца ў якасці даведніка для навуковых супрацоўнікаў і аспірантаў, выкладчыкаў і студэнтаў, якія цікавяцца праблемамі станаўлення беларускай дзяржаўнасці, узаемаадносінамі Беларусі з суседнімі краінамі.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.**

**1.** Першай спробай дасягнуць незалежнасці Заходняй Беларусі і Літвы пад час Першай сусветнай вайны быў распрацаваны праект адраджэння беларуска-літоўскай дзяржавы ў форме Канфедэрацыі Вялікага княства Літоўскага. Праект ўзнік не ў палітычным вакууме, а меў вельмі ўплывовых патронаў. Ідэя Канфедэрацыі ВКЛ не была рэалізавана, бо існавалі значныя рознагалоссі і супярэчнасці паміж дзеячамі беларускага і літоўскага нацыянальнага рухаў. Не быў зацікаўлены ў ажыццяўленні гэтай ідэі і германскі ўрад, які скарыстоўваў супярэчнасці паміж літоўцамі і беларусамі для ажыццяўлення ўласных мэт.

**2.** Беларуска-літоўскія ўзаемаадносіны на працягу 1918-1924 гг. змяняліся ў залежнасці ад палітычных абставін. Былі заключаны два палітычныя дагаворы аб супрацоўніцтве, пры літоўскім урадзе паўстала Міністэрства беларускіх спраў, але пры гэтым кожны бок зыходзіў са сваіх уласных інтарэсаў. Літоўскі бок свядома і выразна пазбягаў якіх-небудзь абавязкаў, якія маглі датычыцца незалежнасці Беларусі. У 1918-1920 гг. адносіны БНР з Літвой ускладняліся тэрытарыяльнымі прэтэнзіямі літоўцаў на землі Беларусі. Беларускія дзеячы, якія бачылі сваю мэту ў стварэнні беларуска-літоўскай дзяржавы, аказвалі магчымую падтрымку Тарыбе. Пагадненні былі важным козырам у правядзенні знешняй палітыкі БНР, абгрунтаванні прад'яўляемых ёю тэрытарыяльных патрабаванняў. Урад БНР заўсёды заяўляў, што Віленшчына і Гродзеншчына – з'яўляюцца неад'емнай часткай Беларусі, падкрэсліваў неабходнасць аб'яднання ўсіх беларускіх этнічных тэрыторый у адзіным дзяржаўным арганізме.

**3.** Важную ролю ва ўсталяванні і развіцці беларуска-літоўскіх узаемаадносін адыграла Міністэрства беларускіх спраў пры літоўскім урадзе. Міністэрства выступала гарантам нацыянальных інтарэсаў беларускага насельніцтва Літвы, сярод якога праводзіла ідэю беларускага нацыянальнага адраджэння.

**4.** Факт заключэння 12 ліпеня 1920 г. мірнага дагавора паміж Расіяй і Літвой, згодна з якім этнічна-беларускія землі перадаваліся Літве, узрушыў беларускую грамадскую думку. Дагавор стварыў юрыдычную аснову для прэтэнзій Літвы на Вільню і частку беларускіх зямель. Савецкая Расія другі раз (пасля Брэсцкага міру) падзяліла Беларусь і тым самым фактычна стварыла маральна-прававыя падставы

для захопу Віленшчыны войскамі Л.Жалігоўскага і ўзнікнення шматгадовага польска-літоўскага канфлікта.

**5.** Узброены захоп Вільні 8 кастрычніка 1920 г. не быў ніякім "бунтам" Л.Жалігоўскага, гэта была добра спланаваная ў польскіх вярхах акцыя. Падзеі польска-літоўскага канфлікту адбываліся на тэрыторыях, дзе беларусы складалі большасць насельніцтва, а беларусы як трэці, зацікаўлены ў гэтай спрэчцы бок, да таго ж і пацярпелы, часцей нават не згадваліся. Таму, беларускія нацыянальныя дзеячы вымушаны былі ўважліва сачыць за развіццём падзей у Сярэдняй Літве. Яны лічылі правядзенне плебісцыту на спрэчных тэрыторыях адзіным правільным варыянтам вырашэння Віленскага канфлікту, абяцаўшы літоўцам падтрымку беларускага насельніцтва краю.

**6.** Літоўскі ўрад пад час Віленскага канфлікту актыўна супрацоўнічаў з беларускімі дзеячамі, бачачы ў гэтым зручны козыр для сваёй уласнай палітыкі. Саюз урадаў БНР і Літвы не прынёс якіх-небудзь канкрэтных і рэальных вынікаў для беларускага боку. Літоўскі ўрад, галоўным чынам, імкнуўся выкарыстоўваць беларускі нацыянальны рух у сваёй барацьбе супраць Польшчы. Ні адзін з суседзяў Беларусі не быў зацікаўлены ў рэальным нацыянальна-дзяржаўным самавызначэнні беларусаў перш за ўсё таму, што яны прэтэндавалі на яе этнічную тэрыторыю.

**Асабісты ўклад суіскальніка.** Дысертацыя прадстаўляе сабой самастойнае аўтарскае даследаванне актуальнай навуковай праблемы беларуска-літоўскіх узаемаадносін, падрыхтаванае на аснове вывучэння і сістэматызацыі шырокага кола крыніц і навуковай літаратуры.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Асноўныя вынікі па даследуемай праблеме былі прадстаўлены ў выступленнях на міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях: Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Знешняя палітыка Беларусі ў гістарычнай рэтраспектыве" (24-25 мая 2002 г., Мінск, БДУ ); "Беларуская дзяржаўнасць: вопыт XX стагоддзя" (18-19 красавіка 2003 г., Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка.); Навуковыя чытанні, прысвечаныя 125-годдзю з дня нараджэння выдатнага гісторыка-славіста У.І. Пічэты, Першага рэктара БДУ (28 кастрычніка 2003 г. Мінск, БДУ, ); XXI век: Актуальные проблемы исторической науки. Международная научная конференция, посвященная 70-летию исторического факультета (15-16 апреля 2004 г, Мінск, БДУ).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыйнага даследавання.** Асноўныя палажэнні даследавання выкладзены ў 9 публікацыях, з іх 3 – ў навуковых часопісах, якія ўнесены ў спіс ВАК для апублікавання вынікаў дысертацыйнага даследавання. Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 90 старонак.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыйная праца складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння і спісу выкарыстаных крыніц (уключае 224 пазіцый). Агульны аб'ём даследавання складае 113 старонак.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва **ўводзінах** даецца агульная накіраванасць даследавання, кароткая характарыстыка ступені вывучанасці тэмы, праблемных пытанняў, звязаных з вырашэннем пастаўленых задач, акрэсліваюцца тэматычныя рамкі дысертацыі.

**Першая глава "Гістарыяграфія і крыніцы даследавання"** складаецца з

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ ПРАЦ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

### Атыкулы ў рэцэнзуемых навуковых выданнях

1. Багалейша С. Канфедэрацыя Вялікага Княства Літоўскага: праекты і здзяйсненні // Беларускі гістарычны часопіс. – 2005 - № 7. – С. 12-17.

**2.** Багалейша С. Польска-літоўскі канфлікт і Беларусь // Весці Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М.Танка. – Серыя 2. – 2005. – № 2. – С. 47-53.

**3.** Багалейша С. Дзейнасць Міністэрства беларускіх спраў пры літоўскім урадзе ў 1918-1924 гг. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2005 . № 9. – С. 22-26.

**4.** Дубік С.(Багалейша С.), Чарнякевіч А. Сярэдняя Літва // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. - Т. 6. - Ч. 1. – Мн: Беларуская энцыклапедыя імя П.Броўкі. 2001, - С. 483-485.

**5.** Дубік С.(Багалейша С.) Адносіны ўрада БНР і Літоўскай Тарыбы: стварэнне і дзейнасць Міністэрства беларускіх спраў // Навуковыя сшыткі ФМА. Дзяржава, гаспадарка, адукацыя. – Вып. 1. – Мн, 2002. – С. 9-20.

**6.** Дубік С.В .(Багалейша С.В.) Пазіцыя Беларускай Народнай Рэспублікі ў польска-літоўскім канфлікце 1920-1922 гг. // Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследавання. Зб. навуковых прац у дзвюх частках. Ч.2. – Мн., 2003. – С. 98-111.

### Тэзісы дакладаў і матэрыялы канферэнцый

7. Дубік С.(Багалейша С.)Палітычныя адносіны паміж урадам БНР і Літоўскай Тарыбай у 1918-1919 гг.; дзейнасць Міністэрства беларускіх спраў //Славянскі свет: міжэтнічныя адносіны на мяжы трэцяга тысячагоддзя. Зборнік матэрыялаў навукова-практычнай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў вышэйшых навучальных устаноў, 16-17 лістапада 2001 года. – Брэст, 2001.- С.196-207.

8. Дубік С.(Багалейша С.) Беларуска-літоўскія ўзаемаадносіны ў 1918-1924 гг. // Гісторыя Беларусі ў еўрапейскім кантэксце. Матэрыялы гістарычных семінараў, якія адбыліся ў Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры ў 2001 г. / Пад рэд. канд. гіст. навук Н. Стужынскай – Мн., 2002. – С.53-82.

**9.** Багалейша С. Праект стварэння беларуска-літоўскай дзяржавы ў форме Канфедэрацыі Вялікага Княства Літоўскага // Беларуская дзяржаўнасць: вопыт XX стагоддзя: Матэрыялы міжнар. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 18-19 красавіка 2003 г. – Мн.: БДПУ, 2004. – С. 17-23.

## РЕЗЮМЕ

**Боголейша Светлана Викторовна**

## БЕЛОРУСКО-ЛИТОВСКИЕ ВЗАИМООТНОШЕНИЯ В 1915-1924 ГГ.

**Ключевые слова:** белорусско-литовские взаимоотношения, Конфедерация ВКЛ, сотрудничество, Министерство белоруских дел, государственность, правительство, договор, организация, политическая партия, войско, оккупация, этническая территория, конфликт.

**Объектом исследования** является история Беларуси I-й четверти XX века в контексте международных отношений в Восточной Европе.

**Предмет изучения** - белорусско-литовские взаимоотношения в 1915-1924 гг., влияние на них внутриполитических и внешнеполитических факторов.

**Цель диссертации** - всесторонний и комплексный анализ основных направлений белорусско-литовских взаимоотношений в период 1915-1924 годов.

**Теоретической основой диссертации** являются основные принципы исторического исследования: историзма, объективности и системности. В исследовании применялись основные общенаучные методы, а также специально-исторические (историко-генетический, сравнительно-исторический, историко-системный и историко-типологический).

**Новизна исследования** обусловлена углубленным изучением проблемы белорусско-литовских взаимоотношений в 1915-1924 гг. В диссертации на основе изучения широкого круга источников проанализированы важнейшие аспекты и направления белорусско-литовских взаимоотношений в 1915-1924 гг., определены основные причины, формы и пути белорусско-литовского сотрудничества в 1915-1924 гг., в результате проведенного исследования проанализированы причины, которые отрицательно повлияли на его эффективность.

**Основные положения и выводы диссертационной работы могут быть использованы** при подготовке справочных и энциклопедических изданий, при разработке общих и специальных курсов, обобщающих работ и учебников по отечественной истории, в частности, по вопросам истории внешней политики Беларуси, для учебных заведений разных ступеней и типов.

## РЭЗЮМЭ

**Багалейша Святлана Віктараўна**

## БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІЯ ЎЗАЕМААДНОСІНЫ Ў 1915-1924 ГГ.

**Ключавыя словы:** беларуска-літоўскія ўзаемаадносіны, Канфедэрацыя ВКЛ, супрацоўніцтва, Міністэрства беларускіх спраў, дзяржаўнасць, урад, дагавор, арганізацыя, палітычная партыя, войска, акупацыя, этнічная тэрыторыя, канфлікт.

**Аб'ектам даследавання** з'яўляецца гісторыя Беларусі І-й чвэрці ХХ стагоддзя ў кантэксце міжнародных стасункаў ва Усходняй Еўропе.

**Прадмет вывучэння** - беларуска-літоўскія ўзаемаадносіны ў 1915-1924 гг., ўплыў на іх унутрыпалітычных і знешнепалітычных фактараў.

**Мэта дысертацыі** - ўсебаковы і комплексны аналіз асноўных напрамкаў беларуска-літоўскіх ўзаемаадносін ў перыяд 1915-1924 гадоў.

**Тэарэтычнай асновай дысертацыі** з'яўляюцца асноўныя прынцыпы гістарычнага даследавання: гістарызма, аб'ектыўнасці і сістэмнасці. У даследаванні прымяняліся асноўныя агульнанавуковыя метады, а таксама спецыяльна-гістарычныя (гісторыка-генетычны, параўнальна-гістарычны, гісторыка-сістэмны і гісторыка-тыпалагічны).

**Навізна даследавання** абумоўлена паглыбленым вывучэннем праблемы беларуска-літоўскіх узаемаадносін у 1915-1924 гг. У дысертацыі прааналізаваны важнейшыя аспекты і напрамкі беларуска-літоўскіх узаемаадносін у 1915-1924 гг., вызначаны асноўныя прычыны, формы і шляхі беларуска-літоўскага супрацоўніцтва; у выніку праведзенага даследавання прааналізаваны прычыны, якія адмоўна паўплывалі на яго эфектыўнасць.

**Асноўныя палажэнні і высновы дысертацыйнай работы могуць быць выкарыстаны** пры падрыхтоўцы даведачных і энцыклапедычных выданняў, пры распрацоўцы агульных і спецыяльных курсаў, абагульняючых прац і падручнікаў па айчыннай гісторыі, у прыватнасці, па пытаннях гісторыі знешняй палітыкі Беларусі, для навучальных устаноў розных ступеняў і тыпаў.

## RESUME

**Bogolejsha Svetlana Viktorovna**

## THE BYELORUSSIAN-LITHUANIAN MUTUAL RELATIONS IN 1915-1924.

**Key words:** byelorussian-lithuanian mutual relations, cooperation, Ministry of byelorussian has put, statehood, government, contract, organization, political party, army, occupation, ethnic territory, conflict.

**The object of research is** the history of Byelorussia of the first quarter of the XX centuries in the context of the international relations in the East Europe.

**The subject of the studying is** the byelorussian-lithuanian mutual relations in 1915-1924, influence on their home political and foreign political factors.

**The purpose of the thesis is** the all-round and complex analysis of the basic directions of the byelorussian-lithuanian mutual relations during 1915-1924.

**Theoretical basis of the thesis is** the fundamental principles of historical research: historicism, objectivity and systematic. Basic scientific methods applied in the study as well as special ones (historical -genetic, historical - comparative, historical -system and historical -typological methods).

**Novelty of research** is caused by the profound studying of the problem of the byelorussian-lithuanian mutual relations in 1915-1924. In the thesis on the basis of studying the broad audience of sources the major aspects and directions of the byelorussian-lithuanian mutual relations in 1915-1924 are analyzed, principal causes, forms and ways of the byelorussian-lithuanian cooperation to 1915-1924 are determined, as a result of the lead research the reasons which have negatively affected it effectivity are analyzed.

**The principal provisions and conclusions of the dissertational work can be used** in preparing help and encyclopedic editions, development general and special courses, generalized works and textbooks on the domestic history, in particular, on the questions of the history of foreign policy of Byelorussia, for educational institutions of different steps and types.